сапраўдных майстроў сваёй справы — леснікі Г. М. Буйнавец, В. С. Перапеча, Л. Д. Мельчанка, В. І. Кунцэвіч. З дня ўтварэння гаспадаркі пачаў сваю працоўную дзейнасць шафёр М. В. Пакацін. Лепшыя лясні́чыя гаспадаркі — М. С. Вянгура, Г. С. Канопліч, Д. П. Кашэвіч, Г. П. Ганчароў. Творча кіруе лесаапрацоўчым цэхам А. П. Ліс. Ад бацькі — патомнага лесавода пераняў любоў да прыроды і М. Д. Дадзько, які прайшоў шлях ад майстра лесу да дырэктара лясгаса. Да яго на гэтай пасадзе за трыццаць гадоў змяніліся толькі два чалавекі: М. С. Бабарыкін і Р. Е. Бондар, якому прысвоена званне «Заслужаны лесавод Беларускай ССР».

*М. Капач*

### За тысячы міль ад Палесся

Гэта буйное акіянскае судна водазмяшчэннем 18 тысяч тон пабудавана ў 1966 годзе. Сотні рэйсаў здзейсніў за гэты час цеплаход «Мазыр», наведаў каля 100 партоў больш чым 30 краін свету. За кармой «Мазыра» — некалькі мільёнаў кіламетраў.

У першым жа рэйсе, калі «Мазыр» ішоў з Ленінграда на Кубу, экіпаж чакала сур'ёзнае выпрабаванне. Атлантыка сустрэла маракоў моцным штормам, а ў трумах стаялі экскаватары. Яны сарваліся са стопараў і сталі біцца аб борт. Некалькі гадзін змагаўся экіпаж з небяспекаю, пакуль не замацавалі машыны.

24 гады працаваў цеплаход без капітальнага рамонту, узнагароджаны Ганаровымі граматамі Чарнаморскага марскога параходства, Ганаровым дыпломам. У жніўні 1969 года «Мазыр» абгінаў паўднёвую частку Афрыкі, калі на судна абрушылася велізарная акіянская хваля, якая сарвала фальшбот паўбака, вентыляцыйныя трубы, выклікала іншыя пашкоджанні. Такое ж выпрабаванне выпала цеплаходу і ў 1974 годзе ў Біскайскім заліве, калі з-за перамяшчэння грузу ўзнік небяспечны крэн, і толькі самаадданыя дзеянні экіпажа вярнулі судна ў нармальнае становішча, і цеплаход не выйшаў з графіка руху. Экіпаж памятае і агнявыя рэйсы 1967—1969 гадоў у В'етнам, калі пад грукат бомб і свіст асколкаў маракі не спынялі разгрузку. «Мазыр» быў адным з першых савецкіх суднаў, якія ўвайшлі ў Хайфон пасля размініравання. Баразніць цеплаход акіянскія воды і цяпер...

*Т. Пілiпчук*

## Імі ганарыцца Мазыршчына

### Героі Сацыялістычнай працы

**Галка Уладзімір Мікітавіч** (н. 13. 10.1923 г. ) — перадавік нафтаздабываючай прамысловасці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння мінамётнай школы накіраваны на савецка-кітайскую граніцу (востраў Даманскі). У пачатку 1942 г. — курсант Чэлябінскага танкавага вучылішча, быў механікам-вадзіцелем танка. Удзельнічаў у баях пад Курскам, многіх іншых баявых аперацыях. Вайну закончыў у Чэхаславакіі, быў тройчы паранены.

З 1951 г. — дызеліст, буравы майстар Беларускай канторы разведачнага бурэння ў Мазыры, затым працаваў буравым майстрам Рэчыцкай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага бурэння трэста «Беларусьнафтагазразведка». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за паспяховае выкананне заданняў 8-га пяцігадовага плана.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны, Славы III ст., медалямі.



У. М. Галка



І. М. Рудкоўскі



А. І. Ліс



П. Н. Антоненка

**Рудкоўскі Іосіф Максімавіч** (н. 15.2.1931 г. ) – перадавік нафтаздабываючай прамысловасці, буравы майстар. У 1971 г. прызначаны галоўным інжынерам буравой № 1 Мазырскай канторы разведачнага бурэння ўпраўлення геалогіі. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў развіцці геолагаразведачных работ, адкрыццё і разведку радовішчаў карысных выкапняў.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Трагічна загінуў у 1996 г.



Д. Ц. Гузман



А. П. Сарокін

## Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

### Прамысловасць

**ГАЦКО Іван Андрэевіч** (г. Мазыр).

**КАВАЛЕНКА Уладзімір Германавіч** (г. Мазыр).

**ПАДГАРЭЦКАЯ Валянціна Савічна** (г. Мазыр).

### Сельская гаспадарка

**ЛІС Аляксандр Ільіч** (в. Тварычаўка).

**САЎЧЫК Міхаіл Уладзіміравіч** (в. Козенкі).

### Будаўніцтва

**АНТОНЕНКА Павел Нікіфаравіч** (в. Малы Бокаў).

**БАГЛАЙ Рыгор Міхайлавіч** (г. Мазыр).

**ГУЗМАН Давыд Цодзікавіч** (г. Мазыр).

**КЕНІК Іван Альбінавіч** (г. Мазыр).



А. У. Міцкевіч



В. Л. Казлова

### Транспарт

**СЕРДЗЮКОЎ Віктар Мікалаевіч** (г. Мазыр).

### Геалогія

**ЛЕБЕДЗЕЎ Васіль Рыгоравіч** (г. Мазыр).



У. Н. Капусцянскі



Ф. Ф. Касуха



З. С. Гуло



М. Ф. Гусак



М. І. Красоўскі



А. І. Пярлоў



Б. А. Файнштэйн



Н. М. Агалец

**САРОКІН Аляксандр Прохаравіч** (г. Мазыр).
**СКАЛАБА Павел Анісімавіч** (г. Мазыр).

**Сувязь**

**МІЦКЕВІЧ Аляксей Уладзіміравіч** (г. Мазыр).

**Медыцына**

**ЮЗЕФСОН Якаў Ісакавіч** (г. Мазыр).
**КАЗЛОВА Вольга Лукінічна** (г. Мазыр).
**КАПУСЦЯНСКІ Уладзімір Нікіфаравіч** (г. Мазыр).
**КАСУХА Філімон Фёдаравіч** (г. Мазыр).
**КРАСОЎСКІ Мікалай Іванавіч** (г. Мазыр).
**ПЯРЛОЎ Аляксандр Іванавіч** (г. Мазыр).
**СКАКУН Іван Пятровіч** (г. Мазыр).
**ФАЙНШТЭЙН Барыс Аронавіч** (г. Мазыр).
**ЧАРНЫШОВА Наталля Васілеўна** (г. Мазыр).

**Народная адукацыя**

**АГАЛЕЦ Надзея Міхайлаўна** (в. Скрыгалаў).
**БАБЫР Еўдакія Емяльянаўна** (г. Мазыр).
**БІСКІН Майсей Барысавіч** (г. Мазыр).
**БЯСПАЛАВА Муза Уладзіміраўна** (в. Міхалкі).
**ГУЛО Захар Сямёнавіч** (г. Мазыр).
**ГУСАК Мікалай Фёдаравіч** (в. Скрыгалаў).
**ДВОРАК Мікалай Мікалаевіч** (в. Каменка).
**ДЗІВАК Галіна Іванаўна** (г. Мазыр).
**ДЗМІТРЫЕВА Кацярына Васілеўна** (г. Мазыр).
**ЗАЙЧЫК Леў Навумавіч** (Мазырскі раён).
**ЗАМЫКА Вера Васілеўна** (г. Мазыр).
**ЗАРЭЦКАЯ Ала Іванаўна** (в. Каменка).
**ЗАХАР'ЯШ Канстанцін Міхайлавіч** (в. Скрыгалаў).
**КАТЛЯРОВА Лідзія Рыгораўна** (пас. Крынічны).
**КРАСОЎСКАЯ Тацццяна Аляксандраўна** (г. Мазыр).
**КУДРЫС Дзмітрый Анікеевіч** (в. Прудок).
**ЛЫСЕНКА Кацярына Еўдакімаўна** (в. Навікі).
**МАРОЗ Ірына Іванаўна** (в. Слабада).
**МІХАЛЬЧУК Надзея Хрыстафораўна** (в. Міхалкі).



М. М. Дворак



Г. І. Дзівак



Л. Р. Катлярова



Т. А. Красоўская



Л. Н. Зайчык



В. В. Замыка



Д. А. Кудрыс



К. Е. Лысенка



А. І. Зарэцкая



К. М. Захар'яш



І. І. Мароз



Н. Х. Міхальчук

**МУРАШКА** Томас Іванавіч (г. Мазыр).
**НЕКРАШЭВІЧ** Аляксандра Парфіраўна (г. Мазыр).
**РЭВУЦКІ** Ігар Мікалаевіч (г. Мазыр).
**САВЕНКА** Вольга Іванаўна (г. Мазыр).
**САДОЎСКАЯ** Любоў Мітрафанаўна (в. Мялешкавічы).
**САЕВІЧ** Ніна Васілеўна (г. Мазыр).
**САЛАВЕЙ** Уладзімір Дзянісавіч (г. Мазыр).
**САЧАНКА** Ніна Дзмітрыеўна (в. Каменка).
**СМІРНОВА** Надзея Фёдараўна (г. Мазыр).
**СЦЁПІН** Канстанцін Мікалаевіч (г. Мазыр).
**ТУРСКІ** Фёдар Антонавіч (в. Слабада).


В. І. Савенка


Л. М. Садоўская


А. П. Царэнка


В. П. Шульга


У. Д. Салавей


Н. Д. Сачанка


Г. С. Яўстратчык


І. І. Бадроў


К. М. Сцёпін


Ф. А. Турскі


К. Г. Высоцкі


Б. І. Цімафееў

**ФЯДОСАВА Галіна Апалінар'еўна** (г. Мазыр).

**ЦАРЭНКА Антон Пятровіч** (в. Вялікі Бокаў).

**ШУЛЬГА Валянціна Пятроўна** (Мазырскі раён).

**ЯЎСТРАТЧЫК Ганна Сцяпанаўна** (г. Мазыр).

**Прафесіянальна-тэхнічная адукацыя**

**СУВОРАЎ Вячаслаў Трафімавіч** (г. Мазыр).

**СУВОРАЎ Мікалай Гаўрылавіч** (г. Мазыр).

**Культура**

**БАДРОЎ Іван Іванавіч** (г. Мазыр).



Я. А. Хомчанка



Р. Е. Бондар



К. Л. Пятроўскі



У. К. Чурыла



А. М. Казлоў



М. П. Савіч

**ВЫСОЦКІ Канстанцін Гаўрылавіч** (Мазырскі раён).
**СКВАРЦОЎ Аляксей Мікалаевіч** (г. Мазыр).

**Меліярацыя**

**ЦІМАФЕЕЎ Барыс Іванавіч** (Мазырскі раён).

**Землеўпарадкаванне**

**ХОМЧАНКА Ягор Апанасавіч** (Мазырскі раён).

**Лясная гаспадарка**

**БОНДАР Рыгор Елісеевіч** (Мазырскі раён).

**Юрыдычная служба**

**ГЕРМАНАЎ Павел Паўлавіч** (г. Мазыр).

**Спорт**

**ДЗЕРАВЯНКА Леанід Андрэевіч** (г. Мазыр).
**ТАРАСАЎ Мікалай Барысавіч** (г. Мазыр).
**ХАРАШУК Іван Мікалаевіч** (г. Мазыр).

**Мастацтва**

**ПУШКАР Мікалай Мікітавіч** (г. Мазыр).

## Лаўрэаты

### Дзяржаўнай прэміі СССР

**ПЯТРОЎСКІ Казімір Люцыянавіч** — будаўнік г. Мазыр.

### Дзяржаўнай прэміі БССР

**ЧУРЫЛА Уладзімір Канстанцінавіч** — будаўнік Мазырскага р-на.

### Адзначаныя вышэйшай урадавай узнагародай — ордэнам Леніна:

**АДЗІНЦОВА Ніна Андрэеўна** (г. Мазыр).
**АРЦЮШЭНКА Марыя Ісакаўна** (в. Драздзы).
**БУКІШ Іван Міхайлавіч** (в. Раеўскія).
**ВІКЕНЦЬЕЎ Казімір Францавіч** (г. Мазыр).
**ВЯГЕРА Мікалай Арцёмавіч** (г. Мазыр).
**ГУСАК Мікалай Фёдаравіч** (в. Скрыгалаў).
**ДЗЕСЯНЦЁР Якаў Рыгоравіч** (в. Козенкі).
**ДРАВІЛА Адам Мітрафанавіч** (в. Гурыны).
**ДУБРОВА Мікалай Кузьміч** (г. Мазыр).
**ЗАХАР'ЯШ Канстанцін Міхайлавіч** (в. Скрыгалаў).
**ЗАЯЦ Мікалай Апанасавіч** (в. Махнавічы).
**КАЗЛОЎ Аляксандр Мацвеевіч** (г. Мазыр).
**КАРАЛЕНКА Фёдар Пятровіч** (г. Мазыр).
**КАШПУР Іван Кірылавіч** (г. Мазыр).
**КНІГА Піліп Міхайлавіч** (г. Мазыр).
**КОНІК Міхаіл Уладзіміравіч** (г. Мазыр).
**КРАСОЎСКАЯ Таццяна Аляксандраўна** (г. Мазыр).
**КРЫЛОЎ Сямён Фадзеевіч** (в. Бібікі).
**КУРОЎСКАЯ Вольга Сямёнаўна** (г. Мазыр).
**КУРОЎСКІ Роберт Іосіфавіч** (г. Мазыр).



Працаўнікі сельскай гаспадаркі Мазырскага раёна, узнагароджаныя ордэнам Леніна. У першым радзе (злева направа): В. С. Куроўская, М. І. Арцюшэнка, Г. Г. Савенка, Г. А. Шумак. У другім радзе: Р. І. Куроўскі, А. І. Мірцюк, І. М. Букіш

**ЛІС Яўгенія Аляксееўна** (в. Тварычаўка).
**МАІСЕЕНКА Аляксандр Міхайлавіч** (в. Козенкі).
**МАКАРАНКА Рыгор Платонавіч** (г. Мазыр).
**МІРАЦЮК Антаніна Іванаўна** (в. Тварычаўка).
**МІТКЕВІЧ Якаў Пятровіч** (г. Мазыр).
**МІЦІН Анатоль Андрэевіч** (г. Мазыр).
**ПАПЕР Міхаіл Якаўлевіч** (г. Мазыр).
**ПЕРАПЕЧА Сцяпан Рыгоравіч** (г. Мазыр).
**ПЛЫШЭЎСКІ Рыгор Іванавіч** (г. Мазыр).
**РУХЛО Надзея Арцёмаўна** (в. Слабада).
**САВЕНКА Ганна Герасімаўна** (в. Козенкі).
**САВІЧ Міхаіл Пiліпавіч** (г. Мазыр).
**СУЗЬКО Міхаіл Іванавіч** (в. Козенкі).
**УС Апанас Рыгоравіч** (г. Мазыр).
**ХРАМЕЦКІ Іосіф Сямёнавіч** (г. Мазыр).
**ШАТАЛАЎ Якаў Апанасавіч** (г. Мазыр).
**ШВЕЦ Філімон Антонавіч** (г. Мазыр).
**ШУМАК Ганна Антонаўна** (в. Белая).

Ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Працоўнай Славы, Дружбы народаў, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку», Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета БССР у 1948—1990 гг. узнагароджана каля дзвюх тысяч чалавек.

Падрыхтавалі
*М. Капач, І. Пiліпчук*

## Ганаровыя грамадзяне Мазыра

**Аляксееўскі Яўген Яўгенавіч** (н. 7.3.1906 г. у г. Баброў Варонежскай губерні), вучоны-аграном, меліяратар. У 1923—1929 гг. быў на камсамольскай рабоце, у 1929—1932 гг. працаваў у партыйных органах Таджыкістана. У 1931—1941 гг. — намеснік наркама земляробства, намеснік наркама воднай гаспадаркі Таджыкскай ССР, начальнік Калінінскага абласнога сельскагаспадарчага ўпраўлення, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Калінінскага абкама партыі.

У гады вайны — камісар і начальнік палітаддзела гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, удзельнік вызвалення Мазыра і Мазырскага раёна.

У 1946—1962 гг. быў першым намеснікам міністра сельскай гаспадаркі Украіны, затым працаваў начальнікам Галоўнага ўпраўлення воднай гаспадаркі пры Савеце Міністраў Украіны, старшынёй Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Украіны па воднай гаспадарцы.

З 1963 г. Я. Я. Аляксееўскі працаваў старшынёй Дзяржаўнага камітэта па арашаемаму земляробству і воднай


К. Ф. Вікенцьеў

гаспадарцы, міністрам меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, іншымі ордэнамі і медалямі.

**Вікенцьеў Казімір Францавіч** (н. 14.11.1910 г. у Мазыры). Працоўную дзейнасць пачаў у 1928 г. рабочым лесапільнага завода. У 1930 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У якасці камандзіра артылерыйскай батарэі прымаў удзел у баях на савецка-фінляндскай вайне.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны на Ленінградскім фронце, быў начальнікам артылерыі стралковага палка, затым камандзірам артылерыйскага дывізіёна, камандзірам мінамётнага палка. У сакавіку 1944 г. накіраваны ў Войска Польскае для фарміравання гаўбічнай артылерыйскай брыгады, з якой ваяваў да дня Перамогі. Удзельнічаў у вызваленні Польшчы, штурме Берліна.

Пасля вайны К. Ф. Вікенцьеў служыў на розных пасадах у Савецкай Арміі, звольнены ў запас у званні палкоўніка. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, чатырма — Чырвонага Сцяга, двума — Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ст., Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Польшчы, многімі медалямі. У 1931—1935 гг. з'яўляўся членам ЦВК Беларусі. Многа гадоў узначальваў камітэт садзейнічання афіцэрам запасу і ў адстаўцы пры Мазырскім ваенным камісарыяце.

Памёр у 1995 г.

**Ганчар Рыгор Фядосавіч** (н. у 1932 г. у в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на). У 1949—1951 гг. вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы. У 1951—1956 гг. служыў на Чарнаморскім флоце. Пасля заканчэння педвучылішча ў 1957—1959 гг. працаваў настаўнікам Асавецкай сярэдняй школы Мазырскага р-на. У 1959 г. быў выбраны сакратаром партарганізацыі калгаса «Чырвоны маяк», затым — «Зара камунізму».

У 1961 г. паступіў на вучобу ў Мінскую вышэйшую партшколу, па заканчэнні якой у 1965—1970 гг. працаваў інструктарам, другім сакратаром гаркама КПБ, лектарам партыйных органаў.

У 1970 г. быў выбраны старшынёй Мазырскага гарвыканкама, які ўзначальваў на працягу 17 гадоў. У 1987—1993 гг. працаваў сакратаром Гомельскага алблвыканкама. З 1993 г. узначальвае Фонд бяспекі дарожнага руху.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, двума ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. 24.10.1994 г. у сувязі з 70-годдзем утварэння Мазырскага гарсавета за шматгадовую працу і вялікі ўклад у развіццё горада Р. Ф. Ганчару прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Мазыра.

**Патоцкая Галіна Канстанцінаўна** (н. у 1923 г. у в. Дудзічы Магілёўскай вобл.). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Працоўную дзейнасць пачала ў лютым 1941 г. загадчыцай фельчарска-акушэрскага пункта ў Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці. У пачатку Айчыннай вайны была мабілізавана ў Чырвоную Армію і служыла ў першым запасным палку 21-й арміі. Была паранена, вярнулася ў родную вёску. Пасля таго як ворагі захапілі Дудзічы, пайшла ў партызанскі атрад імя Варашылава. У жніўні 1943 г. атрымала раненне і была эвакуіравана на лячэнне ў Маскву.

Пасля вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працавала ў

горадзе дзяржінспектарам райздраўаддзела, затым — загадчыцай дзіцячых ясляў № 1, фельчарам, рэнтгеналабарантам. Добра ведаюць Галіну Канстанцінаўну ў горадзе па яе грамадскай дзейнасці, яна неаднаразова выбіралася старшынёй жаночага савета пры райваенкамаце.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Г. К. Патоцкая — актыўны арганізатар гарадскога хору ветэранаў, які зараз носіць званне «народны». У 1995 г. Галіна Канстанцінаўна стала ганаровым грамадзянінам Мазыра.

Былая партызанка ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, Ганаровымі граматамі.

Падрыхтавала
*Т. Пілiпчук*

А. П. Эльман



**Эльман Андрэй Пятровiч** (н. у 1903 г. у г. Елабуга Вяцкай губерні). Працоўную дзейнасць пачаў у 1919 г. Працаваў у камсамольскіх і партыйных органах у Віцебску і Гомелі. Скончыў Інстытут чырвонай прафесуры пры ЦВК СССР. У 1937—1939 гг. — дырэктар Гомельскага педагагічнага інстытута, з 1940 г. — сакратар Гомельскага, Беластоцкага, Новасібірскага, Гродзенскага абкамаў КПБ. У 1948 г. — намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. У 1949—1952 гг. — намеснік старшыні Палескага аблвыканкама, у 1952—1968 гг. — дырэктар, рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута. У сувязі з 90-годдзем з дня нараджэння А. П. Эльману прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Мазыра.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр у студзені 1995 г.

*В. Шур*

# Тут іх карані

Многія ўраджэнцы Мазыршчыны праславілі свой палескі край, жывучы і працуючы далёка ад роднага дому. Гэта знакамітыя вучоныя і дзеячы культуры, відныя военачальнікі, вядомыя спартсмены...

## Ад каваля да акадэміка

У старажытнай вёсцы Барбароў пачынаў у 20-я гады сваю працоўную дзейнасць Міхаіл Мацапура. Тут на землях мясцовага памешчыка Горвата гнулі спіны яго бацькі, тут у 1909 г. нарадзіўся будучы акадэмік. З малых гадоў ён цягнуўся да кавальскай справы, працаваў малатабойцам, памочнікам каваля, зімой вучыўся ў школе.

У 1932 г. Міхаіл Мацапура скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Яшчэ ў студэнцкія гады ён імкнуўся ўдасканальваць і ствараць новыя віды машын. Гэта і прывяло маладога інжынера ў Маскву, дзе ён стаў загадчыкам лабараторыі машын па вырошчванні і перапрацоўцы бульбы УНДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1945 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю па праблемах сельскагаспадарчага машынабудавання, з 1947 г. — акадэмік Акадэміі навук БССР. У гэтым жа годзе Міхаіл Яфрэмавіч назначаны дырэктарам Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай